# бярозка

№10

№ 10/2019(1097)

ISSN 0320-7579





# Агмень

У кніг тыя ж ворагі, што і ў людзей: агонь, вільгаць, жывёлы, надвор'е і іх уласны змест.

Поль Валеры, французскі паэт, філосаф

# «Пакуль мая асноўная задача — гэта штосьці прыдумляць і ажыццяўляць».

**Ягор Свірскі ў 16 гадоў адкрыў уласны бізнес: ён прыдумаў квіз для падлеткаў на сучасныя, хайпавыя тэмы, які так і назваў — Hype quiz. Таксама ён выступае як стэндап-комік.**



**— Ты пачынаў свой праект у падлетакавым узросце. Хто такія сучасныя падлеткі?**

— Зараз падлеткі за кошт інтэрнэту, за кошт сацсетак раз'яднаныя. Усе накіраваныя на самавыяўленне. Медыяпрастора настолькі глабалізаваная, што ў кожнага ёсць свой любімы выканаўца, свае захапленні. Адны не разумеюць другіх, другія не разумеюць трэціх. Дарэчы, ёсць адзіная агульная рыса для ўсіх: раней людзі захоўвалі ў сабе нейкія сакрэты, а зараз наадварот: усе дзеляцца. Я не вельмі гэта люблю. Мне здаецца, трэба аддзяляць асабістае ад грамадскага, таму я гатовы дзяліцца чымсьці, але не ўсім.

**— Як ты трапіў у стэндап?**

— Мне заўсёды падабалася глядзець гумарыстычныя праграмы. У 12 гадоў пачаў гуляць у КВЗ. Праз 4 гады стаў спрабаваць пісаць матэрыял для стэндапа, але яго неяк трэба было праверыць. У Мінску праводзяцца адкрытыя мікрафоны, дзе можа выступіць любы ахвочы. Першы раз я выступіў на адкрытым мікрафоне, каб праверыць матэрыял да ўкраінскага шоу «Рассмеши комика». Было неверагодна боязна, але ўсё прайшло добра — стаў працягваць. Так і пачаўся мой рух у стэндапе.

**— У фільме «У бой ідуць адны старыя» прагучала такая фраза: «Самае цяжкае ў нашай працы — чакаць». Што самае цяжкае ў тваёй працы?**

— Як стэндап-комік ты заўсёды знаходзішся ў напружанні. Ты разумееш, што, калі сёння выступаеш, трэба рыхтавацца, пісаць жарты. Наогул кожны тыдзень ёсць праверка матэрыялу, дзе ты тэстуеш новыя, «свежанапісаныя» жарты.

Я вельмі хвалююся з-за дрэнных выступаў і імкнуся з гэтым змагацца.

Разумею, што без кепскіх выступаў не будзе добрых. Бывае, з пяці хвілін смешнымі атрымоўваюцца толькі дзве. Ты іх захоўваеш, а потым застаецца толькі скампанаваць усё ў адзін матэрыял.

У мяне так нядаўна было, калі ўдзельнічаў у Comedy battle. Мне здаецца, што многія комікі часам сутыкаюцца з цяжкасцямі ў плане дрэнных выступаў. Так што самае цяжкае ў маёй працы — гэта перажываць дрэнныя выступы.



**— Што ты любіш больш: пісаць жарты ці выступаць, распавядаючы іх?**

— Зараз я працую на беларускім шоу «Макаёнка, 9». Трапіў туды праз свайго знаёмага. Я пішу жарты, але сам іх не распавядаю. Ёсць нейкае сваё задавальненне.

Але пісаць і выступаць — гэта два складнікі працы стэндап-коміка. Пасля напісання жарту хочацца ўбачыць рэакцыю на яго. Але ў мяне ёсць думкі напісаць сцэнар для кіно або тэатра. У гэтым выпадку напісанне матэрыялу не патрабуе ўдзелу ў пастаноўцы. Канкрэтных ідэй пакуль няма, але гэта мая мэта на будучыню.

**— Многія комікі выкарыстоўваюць нецэнзурную лексіку ў сваіх выступах, каб «усмяшніць». Ці згодны ты, што дастаткова спашліць — і ты ўжо ў трэндзе, ты ўжо круты?**

— Бываюць моманты, калі людзі няўпэўненыя ў сваім матэрыяле да канца і думаюць: «Зараз я ўзмацню эфект». Гэта працуе, але не на перспектыву. Крута, калі ты можаш напісаць жарт з нейкай думкай. Стэндап — гэта ж не толькі жарты. Ты праз жарты даносіш свае думкі да слухача. У выступленні разгортваеш тэмы,

У апошні час усё больш набірае папулярнасць тэма квізаў. Квіз — гэта спаборніцтва, падчас якога каманды ўдзельнікаў адказваюць на зададзеныя пытанні. Hype quiz — гэта квіз на сучасныя, хайпавыя тэмы. Калі надакучылі сур'ёзныя пытанні, то можна адпачыць, паўдзельнічаўшы ў такім мерапрыемстве.

якія табе блізкія. Я праз жарты дзялюся са слухачом сваімі думкамі наконт узаемаадносін з роднымі, сябрамі. Расказваю пра сітуацыі, з якімі сутыкаюся ў жыцці. Але я нікога не асуджаю, у кожнага свой выбар.

Я лічу, што пачуццё гумару залежыць ад інтэлекту чалавека. У некаторых асацыятыўны шэраг спрацоўвае хутчэй, чым у іншых. Гэта значыць, хтосьці хутчэй можа прыдумаць жарт. Тое, што людзі не чакаюць пачуць, выклікае смех.

**— Ці ёсць чалавек, на якога ты імкнешся быць падобным?**

— Падобным дакладна быць не імкнуся, але часам гляджу на каго-небудзь і думаю: «О, я хачу гэтак жа». Ёсць сітуацыі, у якіх ты праз сваю нявопытнасць не ведаеш, што рабіць. Тады ты глядзіш на людзей, якія так ці інакш табе імпануюць, і выкарыстоўваеш іх веды.

Адна з маіх мэтаў — не старэць душой і сэрцам. Паглядзіце на Кані Уэста: яму 42 гады, але ён вельмі актуальны сёння. Я таксама хацеў бы нават у сталым узросце заставацца актуальным.

**— Ты сапраўдны генератар ідэй. Парай, як прыдумаць класную ідэю. Можа, ёсць нейкі алгарытм?**

— Трэба глядзець, чаго не хапае. Адштурхоўваючыся ад гэтага, думаць, як запоўніць гэты прабел. Новая ідэя нараджаецца, зыходзячы з патрэбаў. Бо навошта прыдумляць тое, што нікому не патрэбна? Я лічу, што калі ідэя вырастае з патрэбаў, то яна ўжо мае перспектыву.

**— Як прыйшла ідэя стварэння квіза для падлеткаў?**

— Бацькі вядуць бізнес, дзядуля таксама гэтым займаўся. Потым я выказаў жаданне вучыцца ў бізнес-школе. Бацькі цалкам падтрымалі. Калі прыйшла ідэя праекта, стала яшчэ цікавей, бо можна было рэалізоўваць свае веды на практыцы.

Тэма квізаў стала даволі папулярнай у апошні час. І наша каманда вырашыла, што было б здорава прыдумаць квіз для падлеткаў. Зараз наша аўдыторыя складаецца з маладых хлопцаў і дзяўчат, якія цікавяцца моднымі тэндэнцыямі.

Праект Hype quiz рэалізаваць было даволі проста. Трэба было скласці заданні, знайсці першых удзельнікаў і выбраць пляцоўку. У той час я гуляў у КВЗ і прыдумваў цікавыя заданні. Пасля таго, як быў зроблены кантэнт, мы вырашылі, што прыйшоў час клікаць людзей. Стварылі суполку ва «Укантакце» і сталі запрашаць сваякоў, сяброў, знаёмых. Так правялі першую пробную гульню. Потым праз знаёмых пра праект сталі дазнавацца іншыя людзі. Цяпер праект Hype quiz пераходзіць на карпаратывы і святы. Мы зразумелі, што гэта больш выгадна і менш энергазатратна.

Чым больш я штосьці раблю, развіваюся, тым лепей сябе адчуваю. Але я разумею, што гэта пачатковы ўзровень. Ёсць жаданне расці. Што тычыцца Hype quiz, я хачу выйсці на той узровень, каб не рабіць усю працу самому, а проста кантраляваць усе працэсы.

Анастасія Правальская

# Girls. Power. BY

Сацыяльна значны праект — адзін са спосабаў развіцця грамадзянскай супольнасці. Калі вы глядзіце на чужы праект і думаеце: «Цікава, я таксама хачу гэтым займацца», то нішто вам не перашкаджае пачаць займацца тым жа ў іншым месцы.

## Які праект:

**Girls. Power. BY** (https://girlspower.by/) — фікшн-інтэрв'ю са знакамітымі жанчынамі Беларусі.

## Хто робіць:

Вольга Няснова — мастачка;
Валерыя Баравец — фікшн-інтэрв'юерка;
Аліна Доўгіх — маркетолаг;
Ірына Круковіч — перакладчыца і рэдактарка.

## Што робіць:

Girls. Power. BY распавядаюць гісторыі знакамітых жанчын Беларусі іх уласнымі вуснамі.

Фікшн-інтэрв'ю — гэта інтэрв'ю, якое ніколі не было запісана падчас жыцця таго ці іншага чалавека. Стваральніцы робяць не падручнік, а вольнае пераасэнсаванне жыцця пэўнай асобы, з-за чаго тэкст перагукацца з сучаснасцю. Гэта той самы момант, калі стагоддзі паміж вамі перастаюць быць значнымі і вы чытаеце быццам бы пра жыццё, матывацыі і пачуцці сваёй сучасніцы — цалкам зразумелыя і блізкія.

І можна паглядзець на партэты тых жа асоб, пра якіх вы чытаеце, — розныя стылі і розныя ўражанні.

## Як далучыцца:

- нагугліць і прачытаць;
- знайсці выбітных і не надта знакамітых жанчын свайго месца:
  - звярніце ўвагу на назвы вуліц і пашукайце сярод іх жаночыя імёны;
  - пашукайце ў сваім горадзе помнікі, не натхнёныя жанчынамі, а прысвечаны ім;
  - знайдзіце, якія мастачкі, літаратаркі, ваяркі, прадпрымальніцы, акторкі і іншыя гераіні нарадзіліся на вашай зямлі (гэта вам у архівы і бібліятэкі);
  - мабыць, у вашым горадзе жыла нейкая выбітная жанчына, якая мела вялікі ўплыў на гэтае месца (звяртайся да архіваў і краязнаўцаў);
- збярыце інфармацыю пра сваю гераіню;
- стварыце тэкст пра яе і дасылайце нам на пошту chas.bjarozka@gmail.com.

## Навошта вам гэта рабіць:

- даведацца новае пра тое месца, дзе вы жывяце;
- дазнацца, што прозішча знакамітага чалавека насамрэч належыць жанчыне, а не мужчыне (кожным разам узгадвайце ўсе жарты пра Эрых Марыю Рэмарк!);
- распавесці іншым пра вашу знаходку, каб яны даведаліся нешта новае, каб вы надрукавалі сваю гісторыю і каб гэтая выбітніца працягвала жыць у стагоддзях быццам бы сучасніца, дзякуючы вам.




# На шляху да лідарства. Валанцёрства

Феномен валанцёрства папулярны, дзякуючы правядзенню буйных падзей з удзелам валанцёраў у краіне і за яе межамі. Усё больш самых розных людзей робяцца часткай канкрэтных акцый і маштабных падзей, падкрэсліваюць сваё жаданне быць карыснымі сваёй краіне, чалавецтву, планеце.

Сапраўдны валанцёр гатовы аддаваць частку свайго часу ўдзелу ў сацыяльна значных праектах. Ім рухаюць ідэалы суверэнітэту — асабістага, грамадскага і дзяржаўнага; спачуванне, жаданне дапамагчы, зрабіць свет лепшым, чым ён ёсць. Па сутнасці, гэта чалавек, які прыходзіць на дапамогу ў патрэбны момант. Прыярытэтныя напрамкі валанцёрства сёння — дапамога неабароненым пластам насельніцтва, падтрымка ідэй грамадзянскай супольнасці, ахова прыроды...

Валанцёры не атрымліваюць заробак не таму, што яны не маюць плёну, а таму, што яны бясцэнныя.

Шэры Андэрсэн

На чым грунтуецца валанцёрства? На незалежнасці (свабодзе дзеянняў), высакароднай мэце і майстэрстве.

Што дае валанцёрства? Многае: значныя вынікі ад значнай дзейнасці, магчымасць асобаснага і прафесійнага росту, падарожжы, удасканаленне моўных навыкаў, міжасобасных і міжгрупавых камунікацый, раскрыццё талентаў і здольнасцяў, павышэнне самаацэнкі, карысныя сувязі, павышэнне шанцаў на атрыманне грантаў і стыпендый. У большасці цывілізаваных краін добраахвотніцкая праца лічыцца неад'емнай часткай жыцця любога грамадзяніна. Гэта становіцца канцэпцыяй сацыяльнай адказнасці кожнага.

Найважнейшая якасць для валанцёра — эмацыйная ўстойлівасць. Важна таксама быць адказным, здольным да далейшага навучання і развіцця, спагадлівым, гатовым аддаць іншым сваю энергію, веды, час.

Сучаснаму чалавеку неабходна мець актуальныя кампетэнцыі ў сферы менеджменту, камунікацый, псіхалогіі, эканомікі. У праграмы фармальнай адукацыі гэтыя дысцыпліны ўключаныя толькі калі яны супадаюць з выбранай прафесіяй альбо факультатыўна. Развіць лідарскія якасці дапаможа валанцёрства. Стань валанцёрам! Паспрабуй сябе ў справе. Засвой карысныя навыкі, знайдзі аднадумцаў.

*Сацыяльная адказнасць (social responsibility) — абавязкі перад сям'ёй, сябрамі і грамадствам у цэлым.*

Як стаць валанцёрам? Спачатку выберы сферу дзейнасці, знайдзі грамадскія арганізацыі, якія працуюць па выбраным профілі. Прапануй свае паслугі.

Лічыш, што ўмееш мала? Сёння ў Беларусі дзейнічаюць школы валанцёра. Іх і шукаць не трэба — на навучанне цябе накіруе ўсё тая ж арганізацыя. Зрэшты, калі ты хочаш вучыцца ў аўтаномным рэжыме, магу параіць табе Школу валанцёра пры рэгіянальных аддзяленнях Беларускай арганізацыі Чырвонага Крыжа, тую ж «Фіяльту». Звярні ўвагу на прапановы праграмы Erasmus+ — праграму Еўрапейскага Саюза ў галіне адукацыі, навучання, моладзі і спорту, якая рэалізуецца і ў Беларусі з 2014 па 2020 год.

Ёсць вопыт падрыхтоўкі валанцёраў і ў БРСМ. Высветлі пра патрэбны табе факультатыўны курс — сёння школы і ліцэі актыўна ўключаюцца ў валанцёрскую дзейнасць. Нядрэнны ход — заявіць пра сябе ў абраным ССНУ або ВНУ.

Вучобу варта спалучаць з практыкай. Сёння ў краіне праходзіць мноства буйных культурных, спартыўных святаў і спаборніцтваў, дзе патрабуюцца валанцёры. Чэмпіянат Еўропы па хакеі, Дні беларускага пісьменства, Фестываль нацыянальных культур у Гродна і ў Мінску, «Славянскі базар» у Віцебску і іншыя. Нядаўні прыклад — II Еўрапейскія гульні, дзе валанцёры з 38 краін выступалі на 8700 пляцоўках. Выпрабаваўшы сябе на мясцовым і рэспубліканскім узроўні, можна замахнуцца і на міжнародны. Можна звярнуцца да сэрвісу «Адукацыя. Інфа» на фэйсбуку або ODB Brussels (тамсама).

У адкрытым доступе велізарная колькасць вакансій на валанцёрскія паслугі ў краінах Еўропы. Школьнікі разам з педагогамі могуць далучыцца да міжнароднай адукацыйнай сеткі iEARN, якая садзейнічае міжнароднаму супрацоўніцтву. У сеціве сотні праектаў, у якіх на бясплатнай аснове можа ўдзельнічаць кожны!

*Валанцёрства (ад лац. Voluntarius — добраахвотны) — гэта сумесная дзейнасць у добраахвотнай неаплатнай форме. Такая дзейнасць дае маладым людзям магчымасць зрабіць унёсак у паўсядзённую працу арганізацый у межах сумесных мерапрыемстваў у інтарэсах грамадства. У якасці асноўнага механізма прасоўвання салідарнасці як каштоўнасці валанцёрства дапамагае пераадольваць важныя сацыяльныя праблемы і задавальняць патрэбы мясцовага насельніцтва. Гэта дазваляе маладым людзям удасканальваць навыкі і кампетэнцыі для асабістага, адукацыйнага, сацыяльнага, грамадзянскага, культурнага і прафесійнага развіцця, тым самым спрыяючы працаўладкаванню і станаўленню актыўнай грамадзянскай пазіцыі.*

Як дасягнуць эфектыўнай работы ва ўмовах валанцёрства? Перш за ўсё надай ўвагу ўліку інтарэсаў і магчымасцяў кожнага добраахвотніка. Іх дапаможа вызначыць стартавая праблемная дыягностыка. Помні, што уключаны ўдзел дазваляе ўсвядоміць важнасць асабістага ўкладу. Агульнымі намаганнямі варта распрацаваць Правілы дзейнасці, Статут або Збор законаў каманды, куды можна ўключыць правы і абавязкі валанцёраў.

Уключы членаў каманды ў сумеснае праектаванне, выкарыстоўвай разнастайныя формы індывідуальнай і калектыўнай дзейнасці: кірмашы ідэй, «адкрыты мікрафон», «мазгавы штурм», конкурсы ініцыятыў і інш. Апісанне прадуктыўных методык можна нагугліць.

Старайся размяркоўваць абавязкі валанцёраў з улікам іх пажаданняў і магчымасцяў, абмяркуй канчатковыя вынікі і перспектывы дзейнасці каманды.

Арганізуй гнуткі кантроль, аналіз і карэкцыю працы валанцёраў на кожным этапе. Старайся падтрымаць, унось прапановы па павышэнні эфектыўнасці супрацоўніцтва.

Як утрымаць сяброў, калі не ўсё і не адразу атрымліваецца? Выкарыстоўвай паступова гэтыя стадыі ўключэння і замацавання валанцёраў:

- стварэнне магчымасцяў (інфармацыйная падтрымка, правілы, інструкцыі, рэгулярнасць мерапрыемстваў і падзякі за ўдзел);

- коўчынг (рэгулярны кантакт, супольнасць, удзел у планаванні і ацэнцы, улік патрэбаў);
- падтрымка на этапе самастойнай працы валанцёра (перадача паўнамоцтваў, выразны функцыянал, раўнапраўны ўдзел кіраўніка, персанальны падыход, давер);
- выкарыстанне вопыту валанцёраў у навучанні новых (папулярызацыя пазітыўнага вопыту, перадача рэсурсаў і каналаў сувязі, творчая прэзентцыя і інш.).

Не варта забываць пра прызнанне ўкладу ў працу:

- уручэнне грамат, падзяк, дыпломаў, сертыфікатаў;
- дэлегаванне на семінары, форумы, злёты;
- выпуск газет і плакатаў, пастоў у сацыяльных сетках па выніках дзейнасці;
- павышэнне «пасады»;
- уручэнне адметных знакаў, атрыбутаў (значкі, кепкі і г.д.);
- падкрэсленая ўвага да калектыву.

Падвядзенне вынікаў працы каманды лепш праводзіць у форме творчай прэзентацыі, тэматычнай вечарыны з сябрамі, партнёрамі, кіраўнікамі зацікаўленых устаноў, прадстаўнікамі мэтавай групы. Добра працуюць на вынік публікацыі ў СМІ, тэлерэпартажы, выставы творчых работ.

Ліна Багданава



# Напісаць раман за пяць простых крокаў:

## ...чытаць бясплатна без рэгістрацыі і смс

*(уводзіны)*

Хлусня, канечне. Не за пяць. І не самых простых.

Не існуе адзінага праверанага часам рэцэпта ў творчасці, што б вы ні стваралі — карціны, скульптуры або тэксты. Не існуе лёгкіх шляхоў да майстэрства, толькі праца, самаўдасканаленне і ўпартасць.

Увогуле рэцэпт існаваць і не можа, бо творчыя індывідуальнасці аўтараў звычайна досыць істотна адрозніваюцца адна ад адной. Магу аўтарытэтна паведаміць: пішуць розныя людзі — нечаканы паварот — па-рознаму. Хтосьці працуе з вялікай формай у адпаведнасці з храналогіяй, утвараючы тэкст, як па цаглінках, па раздзелах. Хтосьці піша «эпізодамі», прычым у самым адвольным парадку, а пасля знітоўвае напісанае «ўстаўкамі». Хтосьці піша кавалачкамі, POV-амі, перамяжаючы ўсё флэшбэкамі, скачучы па храналогіі назад і наперад. «Ліміт знакаў» у кожнага на дзень таксама розны: камусь зручна выдаць і 10 тысяч, хтось выціскае 3.

Адсюль выснова: нельга вучыць розныя індывідуальнасці на адзін капыл. Гэта будзе папросту шкодна. Альбо зусім апусцяцца рукі, або (нават горш) замест своеасаблівай творчай манеры пачнецца паўсвядомае перайманне ўмоўнага «настаўніка».

— А што ж тады рабіць? — спытаеце вы.

Адказ адзіны і досыць просты, насамрэч:

— Працаваць.

а вы сумняваліся?

Так, не можа быць адзінага ўзору, не можа быць рэцэптаў, якія абавязкова прывядуць да поспеху. Але ёсць пэўны шэраг прыёмаў, дзякуючы якім можна ўдала працаваць над тэкстам і над сабою, удасканальвацца як аўтар. Калі вы прымеце гэтае сцверджанне, калі змірыцеся з тым, што хуткага выніку аніяк нельга чакаць, што вынік можа быць дасягнуты толькі самастойна, — тады нам ёсць, пра што размаўляць.

Такім чынам, ***практыкаванне 1***. Глыбока ўдыхніце і паспрабуйце зірнуць на сябе як аўтара збоку.

*Якія ў вас моцныя бакі? Што атрымліваецца лепей, а што — не надта? Ці добра валодаеце мовай? Ці добра ведаеце тое, пра што хацелі б напісаць? Што ўласна вы хочаце сказаць? На якога чытача арыентуецеся (то-бок хто ваш суразмоўца)? Колькі часу можаце працаваць з тэкстам, не стамляючыся? Наколькі ўдала правіце свае опусы?*

І нарэшце галоўнае пытанне: вы **дакладна** ўпэўнены, што хочаце замахнуцца на вялікую прозу?



## 1. Падрыхтоўка да працы і Жудасны Чысты Ліст

*(інструментарый)*

У мяне ёсць знаёмыя, якія пачыналі свой аўтарскі шлях менавіта з раманаў. Вось так, з разбегу. Але, думаецца, гэты шлях таксама не для кожнага, і часта перад працай з вялікай празаічнай формай варта хаця б паспрабаваць сябе ў малой. Хаця б таму, што на прыкладзе невялікага апавядання зможаце пабачыць, наколькі хораша атрымліваецца прадумваць сюжэт, наколькі якасна ўтвараюцца вобразы. Таксама някепска было б паказаць камусьці свае літаратурныя штудыі: водгукі чытачоў часта дазваляюць пабачыць тэкст у нечаканым ракурсе. Рэкамендавала б і звярнуцца да рэдакцыі літаратурнага часопіса (скажам, «Бярозкі»). Каментар літаратурнага рэдактара, які атрымаеце, будзе ў любым выпадку карысны.

Праца літаратара ўнутраная. Ты, быццам рондаль на ножках, ходзіш сабе, а ўнутры варыцца, перамешваецца, булькае ідэйнае варыва. Ідэі сюжэтаў і персанажаў, змешваючыся са штодзённымі ўражаннямі, кіпяць у тваім чэрапе, ажно пакуль не даходзяць да належнай кандыцыі. А вось пасля…

А пасля перад табою белы аркуш паперы (ці вордаўская сімуляцыя на экране камп'ютара). І сам-насам з гэтаю падступнаю беллю многія губляюцца і заміраюць, баючыся яе патурбаваць.

Што важна, не варта міфалагізаваць чысты ліст. Не варта баяцца памылак, якіх яшчэ не існуе. Варта ўзяць ды пачаць. Бо ў кожным аўтары прыхавана нешта, што можа сказаць толькі ён. Так, як можа сказаць толькі ён. Памятайце пра гэта, калі пабачыце перад сабою чысты ліст, які вабіць і пужае адначасова.

Магчымасці заўжды трохі пужаюць, а чысты ліст — гэта квінтэсенцыя магчымасцей, увасабленне творчай свабоды.

Таму, калі не ведаеце, з чаго пачаць, пачніце з чаго-небудзь. Толкін, правяраючы студэнцкія работы (і адчайна нудзячыся ад «вады»), на чыстай паперчыне, гуляючыся, напісаў: «Была ў зямлі нара, а ў нары жыў хобіт». І з гэтай фразы, адной, простай, амаль выпадковай, пачалося цэлае падарожжа да далёкай гары са скарбамі і цмокам.

Аднак той, хто выпраўляецца ў падарожжа непадрыхтаваным, рызыкуе не атрымаць скарбаў, а толькі скласці някепскі сняданак (ці абед) для цмока. Таму не варта забывацца пра падрыхтоўку да працы, асабліва калі замахваецеся на вялікую празаічную форму.

Інструментарый у нас наступны.

**1. Папярэдняе даследаванне тэмы.** Фантазія сама па сабе — гэта выдатна. Але нават фантастычны свет не жывіцца толькі ёю і вымагае рэчыўных дэталяў, якія ўтвараюць «поле гульні» аўтара з чытачом. Напрыклад, калі сетынг утвараецца ў рамках класічнага «сярэднявечнага» фэнтэзі, пачытайце пра тагачасны побыт, пра строі, ежу, грамадскі лад, зброю ды розныя такія рэчы. Праўдападобныя дробязі, што атачаюць вашых персанажаў, робяць і іх, і свет вакол іх жывымі. Робяць «поле гульні» рэальнасцю (хай сабе і другаснай).




Частотная памылка тут, праўда, у тым, што аўтары не ашчадна выбудоўваюць свет з улікам тых жывых драбочкаў, а выліваюць на чытача як з вядра цэлыя энцыклапедычныя артыкулы. З сухою «навуковаю» мовай і (не)кароткімі даведкамі пра розныя не такія ўжо істотныя рэчы. Да душы, чытачу зусім няважна, як правільна называецца дзяржаўны лад у выдуманым вамі каралеўстве. А вось кароткі і эмацыйны каментар аднаго з персанажаў пра ўмоўнага феадала, або вынікі палітыкі нячыстых на руку магнатаў, або які-кольвек уплыў гэтага дзяржаўнага ладу на лёс пратаганіста ды сюжэт, — вось гэта якраз-такі можа даць чытачу вопыт непасрэднага перажывання.




У энцыклапедыях ніхто не жыве, а нам трэба, каб чытач верыў, што свет у кнізе жывы. Праўдзівы. Існы.

**2. Аўтарскі асабісты ўнёсак.** Кніг на сёння шмат. Вельмі шмат. Не ў апошнюю чаргу таму, што выдавецкая справа зрабілася куды больш даступнай: ёсць грошы — выдавайся. Ува ўсіх жанрах пішуць, і пішуць досыць актыўна (а часам, хоць не заўжды, яшчэ і якасна ды цікава). На гэтым агульным фоне цяжкавата вылучыцца, запомніцца. Таму варта прадумаць загадзя, што **сваё**, адметнае вы можаце прапанаваць чытачу, як можаце найлепей прэзентаваць сваю індывідуальнасць.

Гэта можа быць і нетрывільяны погляд на нейкую распрацаваную тэму, і нечаканая трактоўка традыцыйных вобразаў, і выкарыстанне не самай папулярнай міфалогіі падчас пабудовы мастацкага свету твора, і незвычайныя павароты, падавалася б, традыцыйнага сюжэту. Калі разглядаць увесь тэкст як адну вялікую «гульню з чытачом», то парушэнне звычайных правілаў гэтай гульні і неспадзяванкі часта ідуць на карысць, падаграваючы чытацкі інтарэс.



Тое ж тычыцца і стылістычных вышукаў. Незацяганыя метафары, яскравая вобразнасць, жывая нязмушаная мова — усё гэта пойдзе толькі на карысць тэксту. І, безумоўна, аўтару: чым болей працуеш з тэкстам, тым **лепей** працуеш.

**3. Аўтарская сціпласць (таксама інструмент).** Пра гэта часам варта нагадваць самому сабе. А менавіта: тэкст не пра вас. Не для вас. Не дзеля вас. Нават калі ад пачатку так падаецца. Нават калі вы пішаце крывёй уласнага сэрца.

*Вы* расказваеце гісторыю, *вы* хочаце быць пачутым, *вы* прагнеце ўвагі чытача. Таму і думайце пра яго, чытача. Гуляйцеся з ім у створаным вамі свеце, размаўляйце з ім праз сваіх герояў, праз сюжэтныя павароты. Але чытач хоча адказаў <u>на свае</u>, а не на вашыя пытанні, хоча бачыць герояў гісторыі, адсочваць іх прыгоды, дзівіцца таямніцам ды ўражвацца незвычайнымі прыгодамі.




Таму дайце яму гэтую магчымасць. Саступіце ўбок. Забудзьцеся пра ўсялякіх Мэры Сью ды Марці Сцью, гэтых аватараў аўтарскай боскасці ўнутры мастацкага свету. Забудзьцеся пра сябе: вы і без таго ствараеце тэкст з сябе. Кожны вобраз у тэксце і так драбочак вас.

Вы расказваеце гісторыю, не болей і не меней. Калі не будзе вас, гісторыю не раскажуць зусім або раскажуць не так. То цаніце гэта.

І думайце пра чытача.

**4. Цэнтр сусвету (мастацкага).** Згадваючы асаблівасці розных творчых індывідуальнасцей, я казала, што ўсе пішуць па-рознаму. Дадам яшчэ: усе і ствараюць па-рознаму. У кагосьці новы тэкст пачынаецца з аднаго яркага персанажа. У кагосьці — з агульнага ўяўлення пра сюжэт. Некага ж вабіць мастацкі свет увогуле, які паступова, па драбочках, паказваецца, складваецца як вялікая мазаіка.




У кожным з гэтых падыходаў ёсць свае плюсы. І насамрэч не так важна, што для вас знаходзіцца ў цэнтры (сэрцы) новага мастацкага сусвету, у ядры вашага твора. Галоўнае, каб ідэя, укладзеная ў тэкст, хвалявала вас, каб вы хацелі нечым падзяліцца. Каб вы **любілі** тое, што ствараеце.

Недалюбленае звычайна нежыццяздольнае.

**5. Планаванне і рытм працы.** І тое, і другое не пашкодзіць не толькі падчас працы з тэкстам. Але для таго, каб напісаць раман, хаця б прыблізны план неабходны — як, зрэшты, неабходны і працоўны расклад.

Раман не пішацца за адзін дзень. І нават за два. І нават за тыдзень. Нават калі не ўлічваць падрыхтоўчы перыяд, праца будзе досыць працяглая па часе, і да гэтага варта быць гатовым.

Рэкамендую прадумаць зручны расклад, выпрацаваць звычку да пісання ў пэўныя гадзіны. Праца «па натхненні», стыхійная, можа не толькі запаволіць вас, але і папросту прымусіць перагарэць да задумы, асабліва калі ўсё зацягнецца надоўга. Таму лепш за ўсё загадзя ўтварыць для сябе працоўную атмасферу ў канкрэтны час і сядаць за тэкст у любым настроі і стане: па вопыце, гэта той выпадак, калі «апетыт прыходзіць падчас ежы». Праз некалькі дзён такой працы можна ўвайсці ў рытм і прывучыць сябе да больш-менш арганізаванай работы з тэкстам.




У арганізаванасці надзвычай дапамагае планаванне работы на будучыню. Гэта можа быць і сцісла прапісаная сюжэтная канва (умоўна кажучы, шлях персанажаў з кропкі А ў кропку Б), гэта можа



быць спіс асобных ключавых кропак на канкрэтны раздзел. Гэта нарэшце могуць быць апорныя словы ці пералік персанажаў, якіх патрэбна ўвесці на той або іншы момант.

Не будзем забывацца таксама, што вельмі карысна бачыць рэчыўны вынік, плён сваёй работы. Таму не варта пазбаўляць сябе гэтых маленькіх радасцей: адсочвайце, колькі было зроблена за дзень, занатоўвайце асобна. Так, дзень па дні вы будзеце бачыць свой несумненны прагрэс і натхняцца ім.

А значыць, працаваць куды больш аддана.

Падагульняючы сказанае вышэй, давайце звернемся да ***практыкавання 2.***

*Падумайце, якія гадзіны (хаця б 1-2) вы можаце ў сваім дзённым раскладзе вылучыць пад працу з тэкстам. Паспрабуйце прытрымлівацца такога раскладу хаця б тыдзень. Зрабіце накід сетынга, які вам даспадобы, падумайце, якія складнікі сетынга варта прапрацаваць дадаткова. Пастарайцеся ўтварыць кароткую схему падзей, звярніце ўвагу на іх сувязь ці ўзаемаабумоўленасць, лагічнасць.*

І памятайце: лёгка не будзе. Але будзе цікава.

І тое, і другое абяцаю.

Маргарыта Латышкевіч



# Модна — жыць экалагічна

Замест пазначэння актуальнасці тэмы і пытанняў, да якіх мы звернемся ў самім інтэрв'ю, невялікая гісторыя: здаецца, што толькі так атрымаецца перадаць, наколькі для нас значна тое, пра што кажа герой. Пасля таго, як я першы раз пісала інтэрв'ю з экалагічнымі актывістамі, я не магла глядзець на пластыкавыя трубачкі месяц — мяне трэсла і ператоргвала штораз. Потым мяне адпусціла, але я патрапіла на інтэрв'ю да яшчэ аднаго экаактывіста, і пасля гэтага мы паставілі ў рэдакцыі скрыню для накрывак ад бутэлек, я купіла сабе тэрмакубак і пашыла шопер, таму што гэта было невыносна. І калі яно так чапляе і запальвае, то, значыць, у гэтым нешта ёсць. І далей — інтэрв'ю з дырэктарам ЦЭР — Яўгенам Лабанавым.

*Цэнтр экалагічных рашэнняў (ЦЭР) — гэта некамерцыйная ўстанова, створаная ў 2009 годзе для папулярызацыі экалагічнага ладу жыцця і прынцыпаў устойлівага развіцця, развіцця міжнароднага супрацоўніцтва з мэтай захавання навакольнага асяроддзя.*

## Пра свет

Досыць рэдка бывае, што я нешта здзейсніў, і каб мне адразу прыляцеў фідбэк ад прыроды. Але калі мы як грамадства не задумваемся пра тое, што вакол нас, потым атрымліваем у адказ хваробы, пагаршэнне якасці паветра, вадаёмаў, глебы.

Людзям хочацца чагосьці іншага, яны разумеюць, што ў мадэлі грамадства спажывання, калі нас стымулююць купляць больш і больш, нешта не так. Бясконцае спажыванне паступова адштурхоўвае: людзей пачынаюць хваляваць пытанні справядлівасці, узаемадапамогі, салідарнасці. Экалагічны рух — гэта якраз пра салідарнасць, пра супрацьстаянне глабальным карпарацыям, якія нясуць разбуральную для навакольнага асяроддзя і для грамадства філасофію, пра падтрымку мясцовых ініцыятыў, мясцовых невялікіх вытворцаў, мясцовых праектаў.

ЦЭР паказвае, што цяпер модна жыць экалагічна: модна не купляць кожны раз аднаразовы кубак, калі ты хочаш выпіць кавы ці гарбаты, а хадзіць са сваім кубкам; не браць поліэтыленавы мяшочак, а хадзіць са сваёй торбай, авоськай, шоперам; ездзіць не на пяцілітровым пазадарожніку, а на ровары або самакаце.

Ты прыходзіш на Камароўскі рынак, хочаш купіць нейкіх тавараў на вагу, але табе ўсё роўна будуць даваць поліэтыленавы мяшочак хутчэй, чым ты паспееш нешта сказаць. Ты кожны дзень выкідаеш сваё смецце і разумееш, як шмат непатрэбных рэчаў. Уся сфера пабудаваная такім чынам, што ў цябе няма выбару. Ты не можаш, напрыклад, купіць малако ў сваю тару, каб гэта было нармальнае малако, а не разведзенае або апрацаванае. І вытворца не задумваецца пра тое, што будзе з яго таварамі, калі тэрмін карыстання выйдзе і іх трэба будзе выкідаць. І гэта матывуе імкнуцца змяніць сітуацыю і працаваць на тое, каб змянялася стаўленне людзей, каб экалагічныя каштоўнасці пачыналі больш абмяркоўвацца ў грамадстве.




Я хацеў працаваць у экалагічных арганізацыях, спрабаваць нешта мяняць, таму што разумею: уплыў аднаго чалавека вельмі важны, але важна і мяняць нейкія «рамачныя» ўмовы. Мне было цікава рабіць нешта большае, чым проста адмовіцца ад нейкіх тавараў у сваім асяроддзі.

## Як заўважыць, што ў свеце нешта не так

Класе ў 8—9 я зацікавіўся тэмай смецця і звалак. Я займаўся ў секцыі касмічнай біялогіі пры Рэспубліканскім цэнтры дзяцей і юнацтва пад кіраўніцтвам Валерыя Паўлавіча Трыбіса. У космасе людзі вымушаныя жыць у вельмі абмежаваных умовах, у іх няма бязмежнага запасу ежы, кіслароду, ім трэба нешта рабіць з адходамі... І ў гэтым падыходы касмічнай біялогіі дастасавальныя да нашага жыцця на Зямлі, таму што ў выніку Зямля таксама абмежаваная: у нас няма бязмежнай колькасці рэсурсаў, бясконцай колькасці месца — мы не можам вечна яе забруджваць, інакш мы самі проста не выжывем. Мяне ўразіла, калі мы хадзілі на старыя звалкі вакол Мінска. Выкопваеш грунт і бачыш там газету 60-га году, з якой за гэты час увогуле нічога не адбылося: яна як ляжала ў зямлі, так і ляжыць зараз.

Калі зараз паглядзець у сметніцу сучаснага чалавека, то колькасць смецця, якое мы вырабляем у год, павялічылася ў 3 разы ў параўнанні з чалавекам, які жыў у Беларусі ў канцы 70-ых гадоў. Мы пачалі пакідаць невымерна больш смецця, нягледзячы на тое, што ВУП — умоўная велічыня, па якой ацэньваецца эканамічны рост краіны — не павялічыўся ў гэтыя тры разы.

# Чаму мы сябруем



ЖАДАННЕ БЫЦЬ ПОБАЧ З ІНШЫМІ І УСТАЛЁЎВАЦЬ З ЛЮДЗЬМІ ПРЫЕМНЫЯ ЎЗАЕМААДНОСІНЫ, НАЛЕЖАЦЬ ЯКОЙ-НЕБУДЗЬ СУПОЛЦЫ НАЗЫВАЕЦЦА **АФІЛІЯЦЫЯЙ**

ВАЖНЫ СКЛАДНІК УЗАЕМААДНОСІН – ГЭТА **ЭМПАТЫЯ**, ДЗЯКУЮЧЫ ЁЙ АДНОСІНЫ ПРЫНОСЯЦЬ ЗАДАВАЛЬНЕННЕ І ПАЧУЦЦЁ ЎЛАСНАЙ КАШТОЎНАСЦІ



## Мы імкнемся да суполкі іншых людзей

КАБ, ПАРАЎНОЎВАЮЧЫ СЯБЕ З ІНШЫМІ, ПАЗБАВІЦЦА АД НЯЎПЭЎНЕНАСЦІ Ў САБЕ



КАБ АДЧУЦЬ ПРЫЕМНЫЯ ЭМОЦЫІ ПРАЗ ЦІКАВЫЯ, ЖЫВЫЯ ГУТАРКІ



КАБ АТРЫМАЦЬ УВАГУ І ТАКСАМА АДАБРЭННЕ І ЦЁПЛЫЯ СЛОВЫ



КАБ АТРЫМАЦЬ ПАДТРЫМКУ



# Нам важна і прыемна атрымліваць падтрымку

## Яна можа быць

### эмацыйнай



мы разумеем, што пра нас клапоцяцца, нас любяць і высока цэняць

### інфармацыйнай



нам распавядаюць аб з'явах, з якімі мы сутыкаемся, дапамагаюць разабрацца

### інструментальнай



мы атрымліваем канкрэтную дапамогу, напрыклад, нам дапамагаюць вырашыць складанае ўраўненне






Правільнае стаўленне да навакольнага асяроддзя робіцца больш актуальным, таму што мы як чалавецтва набліжаемся да ліміту рэсурсаў на планеце. Папярэднія пакаленні не сутыкаліся так востра з тэмай экалагічнага крызісу, таму што людзей было менш, узровень развіцця тэхналогій быў іншы. А цяпер мы вельмі хутка змяняем умовы для жыцця: клімат, экасістэмы.

Зразумела, што людзі не павінны ўсе станавіцца эколагамі. Ты проста на сваім месцы мусіш мець экалагічны фільтр: глядзець праз свае «акуляры» на прафесійныя пытанні, з якімі ты сутыкаешся альбо будзеш сутыкацца ў жыцці, і трымаць у галаве каштоўнасці, звязаныя з навакольным асяроддзем. Напрыклад, такіх людзей, як я, у Мінску яшчэ 2 мільёны. Яны штодня выкідаюць адзін аднаразовы кубачак — і вакол Мінска растуць горы адходаў, не кажучы пра тое, што, каб гэты кубак выкарысталі, спачатку патрэбныя выкапні, паліва, прыродны газ і г. д. І мы павінны знаходзіцца ў сістэме экалагічных фільтраў, каб заўважаць за прадметамі ўвесь гэты шлях.

Важную ролю адыгрывае кругагляд: ты пачынаеш больш чытаць, глядзець, заўважаць, што адбываецца вакол. На жаль, жыццё сучасных гарадскіх жыхароў вельмі зручнае, таму што яно дазваляе не звяртаць увагу, заплюшчваць вочы на вялікую колькасць праблем, таму што ежу мы бярэм з паліц у крамах, не задумваемся, адкуль з'яўляецца электрычнасць…. Мы моцна адарваныя ад рэальных працэсаў, і даводзіцца быць больш дапытлівымі, больш зацікаўленымі, каб лепш разумець, што стаіць за апошнім модным айфонам.

## Як даваць рады таму, што цябе бянтэжыць

Мы хутчэй ідзём за тым, што адбываецца ў іншых краінах. Там ёсць вельмі добрыя прыклады і досведы, якія ты пачынаеш вывучаць і задумвацца: чаму ў Галандыі ці Германіі тры чвэрці краіны будуць ездзіць на роварах і лічыць гэта нармальным, а ў нас да апошніх гадоў раварыстаў у горадзе было складана заўважыць. Вось з такога аналізу і супастаўлення фактаў могуць нараджацца нейкія праекты.

Для таго каб паменшыць свой экалагічны ўплыў, не патрэбныя кардынальна новыя падыходы, а толькі тое, што ў нас заўсёды было — эканомія, ашчаднасць, разумнае стаўленне да рэчаў. Вядома, у сваім штодзённым жыцці я стараюся менш купляць непатрэбнага, выбіраць тыя рэчы, што будуць служыць даўжэй, звяртаю ўвагу на экалагічнасць, на якасць тавараў, іх упакоўку, здольнасць раскладацца ў смецці.

У Беларусь пачынаюць вяртацца прынцыпы сумеснай эканомікі, калі кожнаму не абавязкова купляць сабе па аўтамабілі або іншым канкрэтным прадмеце. Мы можам сумесна нешта выкарыстоўваць: у нас захаваліся пункты пракату і нават ёсць сучасныя праекты: бібліятэкі інструментаў, каворкінгі і гэтак далей. Гэта ўсё таксама можна разглядаць як экафрэндлі-варыянты, і я гэтым намагаюся карыстацца.

Калі выкарыстоўваць аналогію з хіміі, ёсць такія рэчывы як каталізатары, якія паскараюць нейкія рэакцыі. Мне здаецца, што

Для таго каб паменшыць свой экалагічны ўплыў, не патрэбныя кардынальна новыя падыходы, а толькі тое, што ў нас заўсёды было — эканомія, ашчаднасць, разумнае стаўленне да рэчаў.

ЦЭР — адзін з каталізатараў зменаў, інструмент запуску новых працэсаў, няхай гэта будзе арганічная сельская гаспадарка або экалагічныя звычкі пакупнікоў. Мы прыцягваем увагу да праблем і спрабуем паскорыць іх рашэнне, дэманструем тыя ці іншыя варыянты, што ёсць у розных краінах, ствараем пэўны грамадскі ціск, прыцягваем увагу, каб людзі і дзяржаўныя структуры не ігнаравалі гэтыя працэсы.

Або калі мы гаворым пра праблему, звязаную са скарачэннем біяразнастайнасці, забруджваннем атмасферы хімічнымі рэчывамі, то тут прэсінг прамысловасці і нашага грамадства вельмі вялікі — і нашы пазітыўныя дзеянні не паспяваюць за гэтай хуткасцю. Дакладней, я б сказаў, што мы дзейнічаем і як іншыя хімічныя рэчывы — як інгібітары, якія запавольваюць негатыўныя для навакольнага асяродзя працэсы.

Напрыклад, у нас ёсць праграма па адходах і хімічных рэчывах. Яна мне вельмі блізкая, таму што ў сферы экалагічнай палітыкі намаганні пакуль накіраваныя не на тое, каб кардынальна змяніць сітуацыю, а на тое, каб вырашаць наступствы. Мы спрабуем даць рады «на тым канцы трубы»: калі з трубы нешта цячэ, то мы спрабуем яе заткнуць, паставіць там які-небудзь фільтр, не закранаючы крыніцы праблемы, на жаль.

## Праз што ўсвядоміць «не тое» ў свеце і захацець нешта рабіць

З'ездзіць на экскурсію да звалкі, таму што гэта вельмі моцна ўражвае: ты бачыш канцэнтрацыю усяго таго, што робіць горад. Што яшчэ? Паглядзець фільм The Story of Stuff (with Annie Leonard) («Гісторыя рэчаў з Ганнай Леанард») — гэта дасць штуршок да разумення вастрыні праблемы. Калі вы жывяце ў горадзе, то з'ездзіць куды-небудзь на прыроду, правесці там паўдня, уважліва station назіраць за тым, што вы бачыце. Прырода складана і гарманічна ўладкаваная — наша ўзаемадзеянне з ёй таксама павінна быць разумным, каб мы не з'яўляліся толькі спажыўцамі прыродных рэсурсаў.

Святлана Курганава

## Позні васілёк



Звезена зерне, прыбраны палі,
Пчолы ў вуллі засынаюць.
А сярод гэтай соннай раллі
Сінія вочкі міргаюць.

Дзівіцца кожны на восеньскі цуд,
Хто на сцяжынку ступае.
Усім васілёк усміхаецца тут,
Мілай галоўкай ківае.

Дзіяна Шукурава,
6 «Д» клас, СШ №28, г. Гродна

## Восень завітала



Восень ужо ніжа пацеркамі лета,
Раскрывае ціха шэры парасон.
І ў сон туманны ўся зямля адзета,
Заціхае зноўку пчолак перазвон.

Насяліла шчодра яблыкаў і сліваў,
Ды брусніц насыпала густа ў лясы.
Чырванее ў садзе гронкамі каліна,
Зранку атрасае косы ад расы.

Завязала восень поле ў снапочкі,
Ды ў лузе склала сена ў стагі.
У човен палажыла летнія званочкі,
Атуліла меддзю рэчак берагі.

Карагодам лісця верасень вітае,
Ціха б'е ў шыбы позіркам вятроў.
А праменьчык з хмаркай у хованкі гуляе,
Ластаўкі на крылах пах нясуць дамоў.

Любоў Грэсь,
11 «С» клас, СШ №28, г. Гродна



# Рабінка

Вырасла рабінка
На ўзмежку поля,
Песціць яе сонца,
Птушкі свішчуць у голлі.

Чырванеюць гронкі
Восеньскай парою,
Ападае лісце
Песняй залатою.

Дзівіцца рабінка
Восені-сястрыцы,
Прылятаюць у госці
Бойкія сініцы.

Сумна і маркотна,
Адзінока ў полі.
Толькі для рабінкі
Вецер пяе ў голлі.

# Восеньскі дождж

Дрэмле восеньскі дзень,
Бо маркотна яму.
Зранку дождж зачасціў,
Хіліць поплаў да сну.

Сыпле дробнай імжой
Па змярцвелых палях.
Векавечнай тугой
Церусіць у гаях.

Вецер — сябра даждж у,
Сумных хмар наганяе.
З дрэў апошні ўбор
Дождж упарта змывае.

Б'е нястомна ўзень
Дробны восеньскі дождж.
Вожык шмыгнуў пад пень,
Жук схаваўся пад хвошч.



Анастасія Кулікова,
6 «Д» клас, СШ №28, г. Гродна

ілюстрацыі: kateRch (@kater.ch)

# Кропелька

Аднойчы пасля дажджу Надзейка выйшла на вуліцу. Паветра было чыстае, дыхалася лёгка… На небе павісла вясёлка. Яна сёння была вельмі яскравая, ад яе ішло незвычайнае святло. Апошнія маленькія кропелькі падалі з неба. Адна з іх упала дзяўчынцы на далонь. Кропля апынулася чароўнай і магла размаўляць.

— Дзе я апынулася? — пачуўся звонкі голас.

Дзяўчынка азірнулася, але нікога не ўбачыла.

— Прывітанне! Я тут! Зірні на сваю далонь!

Дзяўчынка зірнула ўніз, на далоні была маленькая празрыстая кропелька.

— Ой, прывітанне! Ты ў маім садзе. А ты хто?

— Я Кропелька-падарожніца.

— Вельмі прыемна. Як добра: у мяне сёння госці! — узрадавалася дзяўчынка.

— А куды я трапіла сёння? — спытала другі раз кропелька.

Надзя здзіўлена зірнула на сваю госцю. Яна не ведала, што адказаць.

— Ну, дзе я, у якой краіне?

Кропельцы вельмі хацелася даведацца. Маленькая гарэза пачала скакаць на далоні.

— Беларусь, — адказала дзяўчынка.

— А якая яна, Беларусь?

— Зараз распавяду. Толькі ты вельмі ўважліва слухай.

Надзейка акуратна ўзяла госцю ды села на лаўку. З-за аблокаў пачало вызіраць цёплае сонейка. Ім так добра было ўдзвюх!

— Ты спачатку заплюшчы вочкі.

— А навошта?

— Не пытай, а ўважліва слухай. А вочы трэба заплюшчыць, каб лепш усё ўявіць.

— Добра, добра, давай хутчэй! — не магла дачакацца кропелька.

Ёй так хацелася даведацца шмат новага. І дзяўчынка пачала свой расказ:

— Беларусь — адна з самых прыгожых краін у свеце. Уяві сабе: бязмежныя зялёныя лясы з гоманам птушак. Глыбокія чыстыя азёры, хуткія звонкія ручайкі. Палі шапочуць сваім калоссем. Паветра поўніцца кветкавым водарам. Аднекуль даносіцца клёкат буслоў. Як гэта прыгожа!

— Сапраўды, нібы ў казцы! — не стрымалася кропелька.

— Цішэй, слухай далей, — зрабіла заўвагу дзяўчынка.

Кропелька з захапленнем слухала Надзейку. Яна нават не рухалася. Дзяўчынка так прыгожа распавядала, што, здавалася, кропелька ўсё бачыла на свае вочы.

— А самае галоўнае — гэта нашы людзі. Яны самыя добрыя і чулыя, таму што ў іх чыстая празрыстая душа.

— Чыстая празрыстая душа — гэта як?

— А вось так. Гэта калі чалавек добры і заўсёды можа прыйсці на дапамогу. Душу чалавека можна параўнаць з чыстай празрыстай шклянкай, якую можна напоўніць чымсьці як добрым, так і дрэнным. Ад пачатку жыцця кожны атрымлівае празрыстую душу. І добрыя ўчынкі робяць яе светлай. А кожны дрэнны ўчынак забруджвае. Вось так. Трэба заўсёды даглядаць сваю душу. Падтрымліваць яе ў

парадку. Каб яна была празрыстай, каб блішчэла як мільён дыяментаў. І памятаць: што ты робіш, такая і будзе твая шклянка. А кожнаму хочацца, каб яна была поўная і празрыстая.

— Я вельмі хачу ўбачыць гэтую краіну і пазнаёміцца з яе людзьмі! — адказала звонкім голасам маленькая кропелька.

І толькі яна гэта сказала, як нечакана дзьмухнуў ветрык і на сваіх крылах падняў гарэзу з рукі дзяўчынкі. Ён панёс яе высока-высока, каб падарожніца магла ўбачыць прыгажосць нашай краіны.

Здалёк даносіўся вясёлы голас кропелькі:

— Да пабачэння! Дзякуй!

— Да пабачэння! Усяго добрага! — крыкнула наўздагон Кропельцы-падарожніцы Надзейка. Было сумна развітацца з новай сяброўкай, але прыемна, што яшчэ хтосьці даведаўся пра Беларусь і цяпер, магчыма, распавядзе пра яе іншым.

Аляксандра Тавоніус,
7 «А» клас, Гімназія №2, г. Мінск



ілюстрацыя: kateRch
(@kater.ch)

Ксенія Шталенкова

# Мне так не хапае...

*...Тварйго кахання,*
*Не хапае твайго цяпла...*
Міхал Бараноўскі, «Тваё каханне»

## I

Насця ўварвалася ў аўдыторыю, дзе ўжо сабралася амаль уся група, але выкладчык, на шчасце, спазняўся горш за яе. Прабраўшыся да вольнага месца побач з сяброўкай, Насця ўзялася калупацца ў торбе, каб выцягнуць у адзін рух патрэбныя нататнікі. Але траплялася розная іншая лухта, якой у торбе ўжо даўно быць не мусіла. Адказны дзень, авітаміноз, жыццё тлен — бінга.

— Няўжо мерзнеш? — абурылася Юля, не адрываючыся ад шпаркага тэкставання ў тэлефоне. — Ты ў курсе, што ўжо вясна чацвёрты тыдзень?

— У сэнсе? — не зразумела Насця.

— У сэнсе, што шапку тваю смешную ўжо можна не надзяваць, даўно плюс на двары!

— Сёння мінус тры перадавалі, — Насця нязручнымі рыўкамі сарвала з сябе і шапку, і куртку, але цяпер прыйшлося прыгладжваць наэлектрызаваныя валасы.

Яе шапка не смешная, яна стылёвая. Калі хтосьці гэтага не разумее, то Насці з імі проста няма пра што размаўляць. Не тое, каб яна вельмі турбавалася пра свой знешні выгляд альбо чыёсьці меркаванне, але часам гэта забівае. «Гэта» — значыць усё. Навокал. Ва ўсім свеце. Шапка нармальная.

Юля скептычна паназірала за яе намаганнямі і зноўку звярнулася да тэлефона:

— Насамрэч гэта ўначы.

— Што ў начы?

— Мінус тры.

— У мяне вушы мерзнуць.

— Насця, нельга быць такой занудай.

— Сама зануда.

Насця расклала перад сабой рэчы і раптам гучна цокнула языком.

— Чаго такое? — пацікавілася Юля, спалучаючы занепакоены тон з пяшчотнай усмешкай у экран.

— Ай, — адмахнулася Насця. — Радыё ў галаве ўключылася.

— І што граюць?

— Не ведаю.

— Праспявай.

Насця на імгненне засяродзілася, але пакруціла галавой:

— Ды я мелодыі не ведаю. Адна фраза круціцца, і ўсё.

— А хто спявае?

— Я ж сказала: не ведаю.

— Ну, мужчына? Жанчына? — з выглядам заўзятага тэрапеўта па любых



пытаннях не адчэплівалася Юля.

— Зараза нейкая. Засела і спявае.

— А пра што?

— Глупства, — мармытнула Насця, паглыбляючыся ў свой канспект.

— Пра што? — не адчэплівалася сяброўка.

Насця маўчала і парывіста гартала старонкі нататніка, дбайна робячы выгляд, што не чуе яе.

— Пра-а-а што-о-о? — нараспеў зноўку запыталася Юля.

— Пра каханне, — Насця быццам бы прызналася, што ў яе сумнеўная хваробіна.

— Ну дык чаго ты, нармальна, — адобрыла Юля.

— Мне зараз не да таго.

— Чаго гэта табе не да таго?

— На практыку сёння ехаць, дыплом яшчэ нават не пачынала, з падпрацоўкай тут таксама трэ' вырашаць... — гаротна пералічвала Насця. — Часу не хапае на каханні розныя.

— Дзевачка мая, — сяброўка сцішыла голас да млоснага шэпту, — дык у нас ёсць прэцэдэнт? Альбо прэтэндэнт?

— Ды які прэтэндэнт? Я наогул кажу!

— Слухай, дык ты мо' тады спачатку закахайся, а потым ужо і з графікам неяк вырашыцца? Вось узяць нас з Вадзікам, напрыклад: усё выдатна, і вучымся, і працуем. Дарэчы, — Юля кінула дзелавіты позірк на экран тэлефона, які пачаў капрызна тромкаць, на імгненне абдзелены ўвагай, і працягнула, — ты да нас сёння прыйдзеш?

— З нагоды? — нахмурылася Насця.

— Я ж табе казала: у нас дзень народзінаў!

— У вас?

— У Вадзіка.

Нарэшце ўвайшоў выкладчык.

— Дык што, прыйдзеш? — аднымі вуснамі паўтарыла Юля.

Насця толькі адмахнулася. Зараз пачнецца: прынарадзіся, вока падмалюй, знойдзем табе прэтэндэнтаў, дзевачка мая. Зводніца.

## II

Здаецца, літаральна толькі што ён стаяў у самым віры натоўпа: аблічча ў аўтобусе мільгаюць, тлумна, усе гайдаюцца з боку ў бок. Але ён зусім не рупіў пра гэта, хаця часам хтосьці і чапляўся за ягоны паўпусты заплечнік. Ён намагаўся займаць як мага меней прасторы, але давалася гэта з цяжкасцю. Хіба калі расцягнуцца пад столлю, але Спайдэрмен з яго так сабе, хутчэй які Майстар Багамол у велічэзных навушніках. Але і пра гэта ён не рупіў таксама. Каб не сумёты, ужо даўно б перасеў на велік, а так нармальна... І вось ужо блізіўся абед, і што ён рабіў тут, у офісе, было цалкам незразумела, бо насамрэч зараз Дзімася мусіў быць у цалкам іншым месцы. А тут гэты праект, і, як заўжды, так недарэчы.

З супрацьлеглага кута іх оўпэн-спэйса пад гогат асабліва адказных калег паліўся гумавы пах растваральнай кавы, і Дзімася цвёрда вырашыў, што прыйшоў час непрыкметна валіць. Але тут ён заўважыў у адбітку манітора, што са спіны да яго падкрадваецца Пяцюня, які ўжо даўно ўзвысіў сябе ў ранг адначасова Дзімасевага лепшага сябра і мамкі. Сцягваючы навушнікі, Дзімася рахмана развярнуўся на крэсле. Так проста выслізгнуць не атрымаецца.

— Нешта ты занадта лірычны, — Пяцюня пакрыўдзіўся, што сябар не даў яму напужаць сябе.

— Ды не, я проста бачыў цябе, — патлумачыў Дзімася.

— А я не пра тое, — паблажліва кінуў Пяцюня. — Людзей пазбягаць стаў, карпіш над работай, увечары дамоў цягнешся замест таго, каб з таварышамі піва нармальна папіць. Альбо ў вас нарэшце з’явіўся мадам? Я магу цяпер быць спакойны за твой далейшы лёс?

— Ды які мадам? Хаця, калі шчыра... Ай не, лухта, — Дзімася страсянуў галавой і адвярнуўся назад да камп’ютара.

— Так-так-так, давай распавядай!

Пяцюня ўзгрувасціўся на Дзімасеў стол з грацыяй, уласцівай адно імпэтным таўстунам. Аднак, як бы спагадліва ён ні зазіраў сябру ў душу, той рабіў выгляд, што не мае настрою працягваць гэтую размову.

— Ну, ты ж разумееш, што я не пайду, пакуль ты не раскажаш,— перасцярог яго Пяцюня і ляпнуў сябра па плячы, прыгваздаваўшы да крэсла, каб не ўцёк. — А праца, між тым, стаіць. І я начальніку скажу, што гэта твая віна.

— Мо' перавесціся на аддалёнку? — спытаў Дзімася.

— Ну, давай ужо. Па вачах бачу, як табе карціць падзяліцца! — Пяцюня адпусціў яго і заёрзаў на стале са злавесным скрыгатам, намагаючыся брутальна закінуць нагу на нагу.

— Ладна. Бабуля ў мяне зараз прыхварэла — ціск і ўсё такое. Дык езджу праведваць.

— У шпіталь ездзіш?

— Ды не, дамоў да яе. Прадукты там купіць, дапамагчы штосьці... Вось...

— Дзімася павагаўся. — Але яшчэ, ведаеш, насамрэч нейкае такое адчуванне, што неўзабаве адбудзецца нешта вельмі харошае. Такое... Нават не ведаю... Сам яшчэ не зразумеў.

— І што, вялікую спадчыну чакаеш? — спытаў Пяцюня, усё ж такі прыладзіўшыся млява абхапіць сябе за адно калена.

Дзімася выразна паглядзеў на яго.

— Ну, тады, значыцца, бабуля твая хутка ачуняе, — знайшоўся сябар.

— Напэўна, — пацепнуў плячыма Дзімася і пачаў ціснуць Пяцюню са стала локцем.

— Ну, мо' хацяб даедзеш да нас сёння ўвечары? Пасля дзяжурства ў бабулі?

Дзімася не перанёс кашчунства і ўзняўся з крэсла:

— Ідзі працуй давай. А я на абед схаджу.

— Ой, памрэш ты старой дзеўкай, Чырвоны Каптурок. Вось гэта я табе гарантую, — з журботным уздыхам паківаў Пяцюня. — Слухай, а я з табой на абед пайду. Дарэчы, ты ў курсе? Да нас практыканткі сёння прыедуць.

— Вось іх тады і пільнуй, — Дзімася захаваў праект і скінуў рэчы ў заплечнік. — А на абед я пайду сам.

Пяцюня так і застаўся сядзець у яго на стале, драпежна прыжмурваючыся ў прадчуванні новых ачмурэнняў, а Дзімася, на хаду закідваючы заплечнік на спіну, пацягнуўся да ліфтаў — адчыніліся адначасова два. Ён зрабіў крок у пустую кабіну, паспеўшы заўважыць краем вока купку дзяўчат, якія нешта ўзбуджана абмяркоўвалі. Шапка крутая.



## III

Насця не паспела агледзецца на працоўным месцы, як яе забяспечылі пакункамі, якія неадкладна трэба было везці ў партнёрскую кантору. Вось так і сказалі: у партнёрскую кантору — гэта вам не жартачкі. Насця пабегла да трамвайнага прыпынку, на хаду правяраючы ў тэлефоне адрас. Яшчэ гэтая паці з нагоды Вадзікавых народзінаў. Ол дэй, ол найт, ну-ну, падарункі вам прыдумляй. Сказалі б канкрэтна, а то ўсё спрэс намёкамі, абцякальна: да стала штосьці. А штосьці ў кожнага сваё, на ўласны густ... Ладна, па дарозе яна недзе заскочыць

у гастраном. Яшчэ б песня гэтая адвязалася. Як там Юля казала? Спець да канца і тады яно прыпыніцца? Трэба праверыць матыўчык. Сеўшы ў трамвай, Насця ўзялася гугліць надакучлівы радок, але пошукавік нічога слушнага не выдаў.

У партнёрскай канторы Насця зарыентавалася нечакана хутка, нават трохі засмуцілася — так нудна. Шпацыруючы назад, яна на імгненне спынілася каля вялікай шыбы, вывучаючы сіняваты адбітак штодзённасці разам з уласным забеганым аблічам. Паветра неяк змянілася ці што? Напэўна, і дрэвы ўжо хутка заквітнеюць, а яна і гэта прапусціць. І праўда, шапку можна зняць, мо' ў жыцці штосьці таксама зменіцца. Насця запхнула яе ў кішэню, заўважыла гастранамічныя словазлучэнні ў сябе над галавой і зайшла ўнутр, рашуча накіраваўшыся адразу ў кандытарскі аддзел.

Падчас вандроўкі ад пячэнек ды вафелек і назад Насці падалося, што за ёй сочыць нейкі цыбаты доўбень у навушніках, які рухаўся ад стэлажа да стэлажа роўненька Насці крок у крок. Вычварэнец. Хаця мо' гэта яна вычварэнка — у кожным незнаёмым хлопцы бачыць пагрозу ўласнай прыватнасці. У момант, калі Насця вырашыла з выклікам развярнуцца да яго і заспець нечаканай рэплікай, доўбень самазабыўна абіраў эклеры, нават не дыхаючы ў яе бок. Відаць, доўбень заняты. Ужо. Ну і ладна, надта патрэбна. Насця ўзяла пад паху самую вялікую каробку цукерак, прыхапіла булачку сабе на перакус і пайшла да касы.



Вярнуўшыся ў офіс, яна высветліла, што Юля сяброўку не дачакалася. Насця ўжо завагалася, ці не ехаць дамоў, каб прабавіць гэты вечар хаця б з якой карысцю, але ў кішэні забомкаў тэлефон. Вядома, куды там, ніякага асабістага жыцця.

— Ты ўжо едзеш? — пачуўся Юлін голас.

— Амаль. Можна я не буду пераапранацца? — папрасілася Насця.

— Ну, я не ведаю, а наколькі ўсё крытычна? Ты дзе зараз?

— Выходжу з офіса. Зараз што-небудзь падыдзе, і паеду да вас. Проста калі я заеду дамоў, то ўжо ўсё — нікуды не выеду зноў. І цукеркі сама з'ем, — рагатнула Насця.

— Ты што, цукерак купіла? — усклікнула Юля.

— Ну, ты ж сказала: «да стала» штось купіць.

— На-а-асця, — працягнула сяброўка. — Ты на ранішнік збіраешся альбо як?

— Цукеркі ядуць усе, і ўвогуле — гэта падарунак, так што не бухці,— павучальна заявіла Насця і дадала: — А то не паеду!

— Ты што, едзь, канешне! Толькі давай хутчэй, а то я адна зусім тут не паспяваю нічога.

Насця адключыла тэлефон і паслухмяна пайшла на прыпынак. Прымусовая сацыялізацыя як заклад гіпатэтычнага шчасця.

## IV

Дзімася пазваніў у дзверы. Яму адчыніла дама яшчэ элегантнага ўзросту.

— О Госпадзі! — усклікнула яна. — Зноў прыцягнуўся! Колькі ж гэта будзе доўжыцца?

Дзімася прайшоў у кватэру і, паставіўшы клункі на падлогу, пацалаваў яе ў шчаку:

— І табе прывітанне, бабулечка, таксама рады бачыць цябе, цудоўна выглядаеш.

Ён сцягнуў боты, скінуў заплечнік і павесіў паліто ў шафу. Бабуля няўхвальна назірала за яго рухамі.

— Што ты сабе за пацеху такую прыдумаў? Са мной усё нармальна. Сябе лепей глядзі.

Дзімася ўзяў клункі і пайшоў па калідоры да кухні. Павярнуўшы галаву цераз плячо да бабулі, якая неахвотна праследавала за ім, Дзімася жыццясцвярджальна абвясціў:

— Я пра цябе клапачуся. Няўжо няясна?

— Мне ўсё ясна, — азвалася бабуля. — Я толькі аднаго не разумею: ты што, маладзейшага каго не можаш сабе для клопату знайсці?

— Гэта мой святы абавязак, — Дзімася адчыніў акно і пачаў распакоўваць клункі каля лядоўні.

Бабуля стала побач.

— Жаніцца, пакуль я жывая, — вось твой святы абавязак, — нарэшце паведаміла яна. — Я яшчэ хачу пагуляць на тваім вяселлі, а не цінянёкацца тут з табой кожны вечар.

— Вячэрала?

— Ты мяне чуеш?

— Ты штосьці гатавала сёння? Мо' давай я? — Дзімася ўзяўся гаспадарыць усур'ёз.

— Адыдзі, я сама, куды ты ставіш? — прабурчала бабуля і адагнала ўнука ад халадзільніка.

Яна пачала перасоўваць прадукты на свой лад, а Дзімася зазірнуў у рондалі на пліце.

— Суп будзеш? Фасолевы, — вынырнула на імгненне з лядоўні бабуля.

— Ды не. Давай лепей гарбаты пап'ем, там піражкі ў клунку.

— У мяне халестэрын, калі ты памятаеш. Стаў імбрык.

Дзімася выліў рэшткі вады і, набраўшы новай, уключыў на імбрыку гузік. Бабуля зачыніла лядоўню і паставіла на стол каробку з эклерамі.

— Ды сядзь ужо, мітусішся пад нагамі толькі, — цыкнула яна на ўнука.

— Ну што ты ўсё буркочаш? — паскардзіўся Дзімася, адстаўляючы зэдлік. — Я ж хачу як лепей, стараюся.

Бабуля заварыла гарбату і паставіла на стол два кубкі, а потым села насупраць Дзімасі, беручы піроржнае.

— Вось скажы мне, — звярнулася яна да ўнука. — Ты нармальны здаровы хлопец, так?

Той кіўнуў галавой у знак згоды і адсёрбнуў з кубка.

— Што ты забыў у мяне? Чаго прыязджаеш кожны дзень?

Дзімася адкрыў быў рот, каб патлумачыць, але бабуля перапыніла яго:

— Толькі не трэба малебен гэты пачынаць зноў. Ну халестэрын, ну ціск узвышаны. У маім узросце гэта — цьху! Не бойся ты, не памру не папярэдзіўшы.

— Бабуля... — мякка абурыўся Дзімася.

— Ну што? Табе так хочацца сядзець тут са мной і чэзнуць? Ужо ў асобную кватэру з'ехаў — дык не, усё роўна да бабкі ціснецца!

У Дзімасі пачаў званіць тэлефон. Ён выцягнуў слухаўку і адбіў выклік.

— Хто гэта? — строга спытала бабуля.

— Ды так. Таварышы.

— І што яны?

— Клічуць у кампанію.

— Во дык і едзь давай!

Дзімася толькі адмахнуўся, працягнуўшы руку за піроржным.

— Не, ну я не ведаю, — пляснула далонямі бабуля. — Ёсць жа ў людзей унукі нармальныя, а майго дык з дому не выпхнуць.

— І з тваім унукам усё нармальна, — паспяшаўся запэўніць яе Дзімася. — Паспею яшчэ. Я ўжо на шляху, праўда!

— На якім шляху? — сцяла вусны бабуля.

— Пакуль не ведаю, але я ўжо там. Гэта дакладна. Я нават адчуваю гэта.

— Ой, балбатун ты, вось што!

Зноў зазваніў тэлефон.

— Зноў таварышы твае? — пацікавілася бабуля.

— Напэўна.

— Так, усё, уставай і едзь да іх, — яна ўзнялася і пачала збіраць са стала.

— Ну, піражку хаця б дай даем.

— Піражкі твае — шкода адна. Зараз жа едзь да сяброў, — загадала бабуля.

— Думаеш? — Дзімася, як мог, цягнуў час.

— Я не думаю, я ведаю! — гэта быў ультыматум.

— А я мо' хачу даглядаць цябе. Мне важна быць патрэбным, разумееш?

— Тады ката вазьмі. Альбо сабачку. Хаця ката лепей, яму ўсё роўна: дома ты, не дома. Галоўнае, каб кармілі.

— Ты не чуеш, — заўважыў Дзімася. — Я хачу быць патрэбным.

— Ну дык будзь! Толькі мне галаву не дуры. Давай, збірайся. У мяне ажно сэрца баліць глядзець, як ты тут сядзіш невылазна.

Дзімася сядзеў у нерашучасці і назіраў, як бабуля мые посуд. Ён ляпнуў сябе па каленах і нарэшце ўзняўся:

— Ну добра. Толькі каб не нудзілася тут без мяне.

Бабуля толькі закаціла вочы.

— Давай хаця б смецце вынесу, — надосталь прапанаваў Дзімася.

— Вынесі ўжо, вынесі, — пагадзілася бабуля. — Мо' хоць так з хаты выйдзеш.

## V

— Мне так не хапае твайго кахання... Не хапае твайго цяпла... Не хапае твайго кахання... Не хапае цяпла...

Дзімася, ціха напяваючы, накіроўваўся да сметніка. У нізе стукнулі дзверы, нехта ўздымаўся па лесвіцы, але ён гэтага не заўважыў. Крокі паскорыліся, на пляцоўцы з'явілася Насця і, убачыўшы Дзімасю, замерла. Ён адышоў ад сметніка і збіраўся ўжо надзець навушнікі, але, заўважыўшы Насцю, таксама спыніўся.

— Гэта ты спяваў? — патрабавальна спытала яна.

— Калі?

— Толькі што.

— Напэўна, я, — пацепнуў плячыма Дзімася. — А ты што, чула?

— Ага, увесь дзень. З самай раніцы.

Дзімася незразумела глядзеў на яе. Некалькі імгненняў яны стаялі моўчкі.

— Ты тут жывеш? — нарэшце прыдумаў, што сказаць, ён.

— Ды не, — пакруціла галавой Насця. — У госці прыехала. А ты?

— Бабулю праведваў.

Ён і яна яшчэ некалькі імгненняў стаялі моўчкі, а потым Насця спытала:

— А што там далей? Якія словы?

...Аблічча ў аўтобусе мільгаюць, тлумна, усе гайдаюцца з боку ў бок. Ён цяпер стаяў у самым віры натоўпа разам з ёй і рупіў толькі пра гэта. Яны ажыўлена размаўлялі, час ад часу выбухаючы рогатам. Яна частавала яго цукеркамі з каробкі, што купіла да вечарыны. А ён насунуў ёй на галаву свае навушнікі і па яе ўсмешцы намагаўся здагадацца, што менавіта яна чуе зараз.



# бярозка




*Штомесячны грамадска-палітычны і літаратурна-мастацкі часопіс (для дзяцей сярэдняга і старэйшага школьнага ўзросту)*
***Выдаецца са снежня 1924 года***
***Узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны»***

Заснавальнік
Вытворча-выдавецкае рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Дом прэсы»

Галоўны рэдактар
Кацярына Вячаславаўна Каплун

Рэдакцыйная калегія:
Алесь Бадак, Валерый Гапееў, Алесь Дуброўскі, Уладзімір Ліпскі, Алена Масла, Міхаіл Мірончык, Людміла Рублеўская, Аляксей Чарота, Таццяна Швед.

Адрас рэдакцыі
Юрыдычны і паштовы адрасы:
Рэспубліка Беларусь, 220013, г. Мінск,
вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.
chas.bjarozka@gmail.com
Тэл.: 8 (017) 287-19-27, 8 (017) 287-16-98.

Падпісныя індэксы:
74822 — індывідуальны
74888 — індывідуальны льготны для членаў БРПА
748222 — ведамасны
74879 — ведамасны льготны для ўстаноў адукацыі і культуры

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі сродку масавай інфармацыі №210 ад 25.07.2019, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь

Выдавец
Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Дом прэсы».
Дырэктар
Фёдар Пятровіч Караленя

Намеснік галоўнага рэдактара:
С. М. Курганава
Мастацкі рэдактар, камп'ютарная вёрстка:
В. С. Дзяткова
Стыль-рэдактар:
П. У. Забела

Падпісана да друку 22.10.2019 г.
Фармат 60×84 1/8. Друк афсетны.
Ум. друк. арк. 3,72. Ул.-выд. арк. 3,42.
Тыраж 523 экз. Заказ ??.

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «БудМедыяПраект»
ЛП № 02330/71 ад 23.01.2014,
вул. В. Харужай, 13/61, 220123, Мінск, Рэспубліка Беларусь

© РУП «Дом прэсы», 2019

**01** Інтэрв'ю. «Пакуль мая асноўная задача — гэта штосьці прыдумляць і ажыццяўляць».
**04** Ініцыятыва. Girls. Power. BY
**05** Праект. На шляху да лідарства. Валанцёрства
**09** Практыкум. Напісаць раман за пяць простых крокаў: ...чытаць бясплатна без рэгістрацыі і смс
**14** Гісторыя поспеху. Модна — жыць экалагічна
**20** Заяўка на Парнас. Паэзія
**22** Заяўка на Парнас. Проза
**24** Літаратурныя старонкі. Проза. Ксенія Шталенкова. Мне так не хапае...

Аўтар вокладкі і разварота: Nollaig Lou (@nollaiglou).

Тэма наступнага нумара — «Трымценне».

Суполка часопіса ў : @bjarozka.



**«Музыка даўніны»**
**Аўтарскі праект Уладзіміра Цвіркі**

Гродзенская вобласць, Навагрудскі раён, вёска Баярская, вадзяны млын, пач. XX стагоддзя



## Конкурс дэтэктыўных гісторый

**па «Практыкуме» Ксеніі Шталенковай «Як напісаць дэтэктыў і не здзейсніць злачынства»**

Напішыце кароткую дэтэктыўную гісторыю — фантастычную ці натхнёную рэальнасцю

Парады Ксеніі Шталенковай і ўмовы конкурсаў шукайце ў суполцы «Часопіс "Бярозка"»

## Конкурс «Дзёрзкія тэорыі беларускаці: мова, культура, гісторыя, міф»

Прыдумайце, як утварыліся тыя ці іншыя ўнікальныя словы ці выразы, патлумачце, чаму яны маглі ўзнікнуць менавіта ў Беларусі

Намінацыі:
- мастацкія тэксты;
- мастацка-публіцыстычныя тэксты;
- навуковыя тэксты



ISSN 0320-7579